Onliner.by
21.02.2019

# Mark Formelle выпусціў калекцыю беларускамоўных шкарпэтак. У фотасесіі ўзялі ўдзел незвычайныя мадэлі

Александр Чернухо

У Міжнародны дзень роднай мовы Mark Formelle прэзентаваў лімітаваную калекцыю шкарпэтак #МоваГэтаСтылёва. У якасці мадэляў у промаздымках паўдзельнічалі супрацоўнікі Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі. Атрымалася крута!

Міжнародны дзень роднай мовы, абвешчаны ЮНЕСКА, першы раз адзначылі ў 2000 годзе. Спецыяльна да такога свята Mark Formelle выпусціў калекцыю шкарпэтак #МоваГэтаСтылёва і паказаў у ёй тыя асаблівасці беларускай мовы, якія ўсе жыхары нашай краіны ведаюць яшчэ са школы: “Жы” і “Шы”, “Дж” і “Дз”, “Ў” і “І”.






— *Сёння яркія і незвычайныя шкарпэткі носяць амаль усе: і айціўнікі, і офісныя работнікі, і прадстаўнікі творчых прафесій. Гэты элемент гардэроба дазваляе «вылучыцца з натоўпу» і быць стыльным у любым вобразе,* — распавядае Наталля Суворава, кіраўнік аддзела маркетынгу брэнда Mark Formelle. — *Мы выпусцілі калекцыю*

*#МоваГэтаСтылёва спецыяльна для тых беларусаў, якія любяць і модную вопратку, і родную мову, незалежна ад таго, размаўляюць на ёй у паўсядзённым жыцці ці не.*







Здымка лукбука калекцыі прайшла ў нестандартным для моднага адзення фармаце. Замест арт-прастор і подыумаў — чытальныя залы Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі. А на месцы прафесійных мадэляў — супрацоўнікі галоўнай бібліятэкі краіны.






— *Гэта быў вельмі незвычайны, але вельмі круты досвед,* — распавядае Onliner адна з мадэляў, Юлія Валуева. — *Калі нам прапанавалі такую ідэю, мы адразу пагадзіліся, таму што гэта, натуральна, папулярызацыя беларускай мовы, а яшчэ гэта магчымасць паказаць, што ў бібліятэках працуюць сучасныя прыгожыя людзі, якія апранаюцца з густам. У бібліятэцы праводзіўся сапраўдны кастынг, нас фатаграфавалі, а потым зрабілі адбор. А ўжо здымкі для фотасесіі праводзіліся вельмі доўга, але вынік атрымаўся нават круцей, чым мы чакалі.*






*— Мы заўсёды шукаем новыя і неардынарныя шляхі папулярызацыі роднай мовы, таму з задавальненнем прынялі ўдзел у праекце #МоваГэтаСтылёва,* — распавядае начальнік сацыякультурнага цэнтра Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі Радміла Букач. — *У бібліятэцы можна пазнаёміцца з дакументамі, якія дазваляюць прасачыць развіццё беларускай мовы, таму што ў нашых фондах захоўваюцца 10 выпускаў Бібліі Францыска Скарыны, датаваныя 1517—1519 гадамі, рукапіс сатырычнай «Прамовы Мялешкі» XVII ст., адзінае прыжыццёвае выданне Максіма Багдановіча «Вянок» з аўтографам аўтара і найноўшыя кнігі нашых сучаснікаў.*






Шкарпэткі з калекцыі #МоваГэтаСтылёва ўжо ёсць у продажы, але серыя лімітаваная: адна пара на кожныя 700 беларусаў.








З Міжнародным днём роднай мовы!